# Літаратурны квэст “Павуціна”.

**10 красавіка 2025 года** ў рамках *тыдня агульнаадукацыйных дысцыплін* у каледжы быў праведзены выкладчыкам *Емельянцавай В.М.* **літаратурны квэст “Павуціна”** ў групе №7.



Літаратурны квэст быў прызначаны пашырэнню ведаў пра першадрукара Францыска Скарыну, пра слаўныя постаці беларускай літаратуры.




Падчас гульні навучэнцам прадставілася магчымасць уявіць літаратурныя сувязі ў выглядзе павуціны, разблытаць іх і зразумець, кім ёсць Скарына для нашага народа.



Удзельнікі мерапрыемства праявілі кемлівасць і знаходлівасць, адказваючы на розныя пытанні, склалі пазл і растлумачылі выказванне пра асобу, якой ганарыцца кожны беларус.



У канцы літаратурнага квэста знаўцы дзейнасці першадрукара падвялі вынік, што Францыска Скарына выдатны чалавек, які адкрыў беларускаму народу шлях да асветы, натхніў на ўласную творчасць.




Ад падарожжа ў свет літаратуры ўсе атрымалі вялікае задавальненне.

